2), однако необходимо отметить, что благодаря проводимой государственной политики по поддержке высшего медицинского образования в БССР в т.ч. увеличение набора студентов в медицинские вузы, уже к концу 1950 года наметилась существенная динамика роста врачей в БССР по сравнению с 1940 годом (Таблица 3) [10, л. 50–59].

Таблица 2

| Наименование медицинских кадров | | Количество | |
|---|---|---|---|
| Врачи | в городах | 1581 | 45,6% к уровню 1940 года |
| | в сельской местности | 587 | 75,4% к уровню 1940 года |
| Зубные врачи | в городах | 292 | 44,5% к уровню 1940 года |
| | в сельской местности | 160 | 42,9% к уровню 1940 года |
| Фармацевты | | 1047 | 68,7% к уровню 1940 года |

*Примечание: медицинские кадры БССР на начало 1946 г.*

Таблица 3

| Наименование | 1940 | 1950 |
|---|---|---|
| Число врачей всех специальностей (все ведомства) | 5214 | 7210 |
| Обеспеченность населения врачами | 5,7 | 9,3 |

*Примечание: в таблице показана динамика роста врачей в БССР и обеспеченности ими населения на 10 000 чел. с 1940 по 1950 г.*

Система высшего медицинского образования БССР в историческом периоде послевоенного восстановления страны всегда находилась на лидирующих позициях в структуре здравоохранения Беларуси. Высшие медицинские учреждения образования внесли значительный вклад в возобновлении работы системы здравоохранения страны. Трудовые коллективы медицинских институтов принимали самое активное участие в восстановлении лечебных учреждений, ликвидации санитарно-эпидемиологических последствий войны, подготовки кадров для системы здравоохранения страны, чем помогли решить многие проблемы практического здравоохранения послевоенного периода. Благодаря героическому труду коллективов медицинских институтов Беларуси к концу послевоенной пятилетки (1946–1950) система здравоохранения страны постепенно начала возвращаться к довоенному уровню, как и по количеству лечебных учреждений, так и по количеству медицинских кадров и общему уровню оказания медицинской помощи населению.

1. Конституция (Основной закон) Союза Советских Социалистических Республик 1977 г.
2. Высшая медицинская школа в СССР / С.Я. Чикин и [др.]. – М. : Медицина, 1973. – 187 с.
3. Государственный архив Витебской области (ГАВО). – Ф. 2853. Оп. 1. Д. 3.
4. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / пад рэд. М. Касцюка [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва: 2000–2011. – Т. 6: Беларусь у 1946–2009 гг. / Л. Лыч [і інш.]. – 738 с.
5. ГАВО. – Ф. 2853. Оп. 1. Д. 17.
6. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). – Ф. 46. Оп. 9. Д. 2.
7. ГАВО. – Ф. 2853. Оп. 1. Д. 36.
8. Седых, А. И. Санитарные последствия Великой Отечественной войны и немецко-фашистской оккупации в Беларуси / А. И. Седых // Сб. мат. VII Респ. научн. конф. Истории медицины 7-9.09.1995. – С. 14–15.
9. НАРБ. – Ф. 218. Оп. 7. Д. 17
10. ГАВО. – Ф. 2853. Оп. 1. Д. 2.

## АСАБЛІВАСЦІ РЭАЛІЗАЦЫІ ПЯЦІГАДОВАГА ПЛАНА АДНАЎЛЕННЯ І РАЗВІЦЦЯ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ Г. ВІЦЕБСКА Ў 1946–1950 ГГ.

*Н.А. Пятрэнка*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Тэматыка вывучэння пасляваеннага аднаўлення гарадоў Савецкай Беларусі апошім часам усе больш прыцягвае ўвагу даследчыкаў сваёй актуальнасцю. Гэта абумоўлена тым, што дадзены перыяд застаецца слабавывучаным, а перад навукоўцамі адчыняецца вялікае даследніцкае поле. Пры вывучэнні паляваеннага горада асноватворным накірункам з'яўляюцца пытанні рэалізацыі першых аднаўленчых мерапрыемстваў.

Репозиторий ВГУ

Мэта артыкула – выявіць асаблівасці і асноўныя накірункі рэалізацыі пяцігадовага плана ў 1946–1950 гг. па аднаўленню і развіццю г. Віцебска.

**Матэрыял і метады.** Аўтарам былі прааналізаваны выданні беларускіх даследчыкаў па акрэсленай тэме. Напісанне артыкула ажыццяўлялася з выкарыстаннем дакументальных матэрыялаў Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці. Даследаванне грунтуецца на прынцыпах аб’ектыўнасці і гістарызму, у аснову пакладзены гісторыка-параўнальны, гісторыка-сістэмны і гісторыка-праблемны метады.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** За перыяд Вялікай Айчыннай вайны жыхарам г. Віцебска былі нанесены велізарныя духоўныя і матэрыяльныя страты. На 26 чэрвеня 1944 г. у горадзе ад даваенных паказчыкаў засталося меней за 1 % ад насельніцтва, 6.4 % ад жыллёвай плошчы і 3 % прамысловых аб’ектаў, гарадская інфраструктура была поўнасцю знішчана [4, с. 41]. Галоўнай задачай кіраўніцтва і насельніцтва г. Віцебска з’яўлялася неабходнасць правядзення паскоранымі тэмпамі аднаўленчых мерапрыемстваў па адраджэнню горада. Асноўныя пытанні па рэалізацыі дадзеных мерапрыемстваў на тэрыторыі г. Віцебска вырашаліся згодна з «Чацвёртым пяцігадовым планам аднаўлення і развіцця народнай гаспардаркі БССР 1946 – 1950 гг.» [1, с. 26]. Дадзены дакумент ставіў галоўнай мэтай аднаўленне гарадскіх тэрыторый, а таксама дасягненне ўзроўню жыцця даваеннага часу.

Для каардынацыі дзеянняў на месцы быў распрацаваны «Генеральны план аднаўлення і планіроўкі г. Віцебска Белрускай ССР на пяцігоддзе 1946–1950 гг.». Дакумент быў зацверджаны рашэннем Выканаўчага камітэта Віцебскага Гарадскога Савета дэпутатаў працуючых 7 ліпеня 1947 г. [2, арк. 1]. Згодна з палажэннямі, асноўныя накірункі былі наступныя: аднаўленне і рэканструкцыя жыллёвага фонду, прамысловага комплексу і добраўрпарадкаванне гарадскіх тэрыторый. Асноўная інфармацыя па выніках рэалізацыі плана была знойдзена ў матэрыялах выканання першага пасляваеннага пяцігадовага плана і развіцця народнай гаспадаркі г. Віцебска, што ўтрымлівае справаздачную дакументацыю да чэрвеня 1951 г. [3, арк. 90].

Адным з галоўных элементаў палітыкі адраджэння з’яўлялася жыллёвае будаўніцтва. Трэба вызначыць, што аднаўленчыя мерапрыемствы ўскладняліся як з-за недастатковай колькасці будаўнічых матэрыялаў, так і па прычыне адсутнасці працоўных. У спаваздачах неаднарозова падкрэсліваецца, што план жыллёвага будаўніцтва не можа быць рэалізаваны поўнасцю. Згодна з пяцігадовым планам прадугледжвалася засвоіць 34500 тысяч рублёў, аднак рэалізавалі толькі 11553 тыясяч рублёў, што адпавядала 33.5 %. Але нягледзячы на вялікія складанасці, за пяцігоддзе было ўведзена 17483 квадратных метра жылллёвай плошчы ў цэнтральных частках і 45992 квадратных метра ў індывідуальным сектары. Пры гэтым капітальны рамонт і добраўпарадкаванне жыллёвага фонда мелі станоўчую тэндэнцыю рэалізацыі: пяцігадовым планам прадугледжвалася засвоіць 14460 тысяч рублёў, а атрымалася 11730 тыясяч рублёў, што адпавядала 81 % [3, арк. 91]. Пры рашэнні жыллёвага пытання можна заўважыць шэраг праблем з недахопам будаўнічых матэрыялаў і працоўных. Аднак, трэба падкрэсліць і павольнае павелічэнне жыллёвай плошчы, а таксама станоўчыя вынікі рамонту ацалелых будынкаў г. Віцебска.

За перыяд 1946–1950 гг. адным з асноўных накірункаў аднаўлення стала прамысловае будаўніцтва. Трэба вызначыць, што некаторыя прамысловыя будынкі адрадзіліся на мінулых месцах, а іншыя былі пабудаваныя на новых тэрыторыях. Пры аднаўленні атрымалася зберагчы даваенны профіль развіцця, накіраваны на вытворчасць лёгкай прамысловасці. Аднак, было вырашана павялічыць ролю вытворчасці прадукцыі апрацоўкі металаў, будаўнічых матэрыялаў і станкабудавання. Паказчыкі справаздачнай даументацыі па рэалізацыі запланаваных сродкаў на прамысловае будаўніцтва былі наступныя: цяжкай прамысловасці на 59 %, лёгкай прамысловасці на 95.5 %, мясамалочнай прамысовасці на 90.5%, харчовай прамысловасці на 95.5 % і станкабудавання на 100 % [3, арк. 2]. За пяць год вытворчасць цяжкай прамысловасці павялічылася з 4.7 % да 16.3 % ад усёй валавай прадукцыі горада. Валавы выпуск прадукцыі дзяржпрадпрыемствамі, а таксама мясцовай і кааператыўнай прамысловасцю быў вышэй запланаванага [2, арк. 12]. Мерапрыемствы па рэалізацыі адраджэння прамысловага сектара г. Віцебска мелі дастаткова пасяховыя вынікі. Кіраўніцтва горада актыўна падтрымлівала аднаўленне аб’ктаў прамысловасці як галоўных горадабудаўнічых фактараў.

План пабудовы адміністрацыйных, культурна-бытавых і камунальных установ г.Віцебска, згодна з запраектаваным аб'ёмам будаўніцтва за 1946–1950 гг., складаў 1659.9



Репозиторий ВГУ

тысяч квадратных метраў [2, арк. 13]. За вызначаны перыяд быў пабудаваны філіял абласной клінічнай бальніцы, колькасць ложкаў павялічылася да 293 штук, а ўрачэй да 290 чалавек. Нягледзячы на гэта назіраўся недахоп месцаў і медыцынскага персаналу. За аднаўленчую пяцігодку распачалося будаўніцтва савецкіх партыйных і грамадскіх устаноў – з'явіліся будынкі Гарвыканкама і Аблвыканкама. Па сістэме народнай адукацыі ў горадзе адчынілі свае дзверы яшчэ 4 школы, на 1950 г. ужо працавала 18. Атрымаў свой будынак і Педагагічны інстытут. Пры гэтым колькасць вучняў ў школах вырасла з 8117 вучняў (на 1945 г.) да 12765 вучняў (на 1950 г.), а ў вышэйшых і сярэдніх установах колькасць студэнтаў павялычылася адпаведна з 515 да 3600 чалавек. Гандлёвая сетка вырасла з 108 да 403 кропак, а рознічны тавараразварот вырас з 77 да 355 мільёнаў рублёў [3, арк. 91]. Нельга не заўважыць, што асноўны акцэнт у аднаўленні сацыяльнай інфраструктуры быў накіраваны на адраджэнне аб'ектаў сістэмы народнай адукацыі і аховы здароўя, а таксама грамадскіх устаноў.

Пасляваенны стан гарадской камунальнай гаспадаркі характарызаваўся поўным заняпадам і на першым этапе мерапрыемствы былі накіраваныя на ачышчэнне тэрыторый. Толькі пасля навядзення пардку пачалі рэалізоўвацца планы добраўпарадкавання і інжынернага абсталявання гарадскіх тэрыторый. На камунальнае будаўніцтва пяцігадовым планам прадугледжвалася патраціць 10325 тысяч рублёў, рэалізавана ж было 17538 тыясяч рублёў, што адпавядала 170 % ад запланаванага. У даваенным горадзе трамвайныя шляхі звязвалі прамысловыя зоны і цэнтральную частку, па-за межамі якіх фарміраваліся аўтобусныя маршруты. За вызначаны перыяд аднавілі і пабудавалі трамвайныя шляхі на 26.5 кіламетраў, а таксама запусцілі 42 вагона [3, арк. 90].

Добраўпарадкаванне сістэм забеспячэння вадою і электраэнэргіяй бачыліся аднымі з важных накірункаў аднаўленчай палітыкі. Крыніцай электраэнэргіі для горада стаў энэргацягнік запушчаны ў маі 1945 г., а з 1946 г. асноўны аб'ём энэргападачы ўзяла на сябе адноўленая БелГРЭС [1, с. 387]. За разглядаемы перыяд у горадзе ў 6 разоў была павялічана падача вады ў сетку і адноўлены 2 ваданасосныя станцыі на Пяскавацiку і Маркаўшчыне. За перыяд першай пасляваеннай пяцігодкі вялікая ўвага надавалася добраўпарадкаванню тэрыторый: былі заасфальтаваны тратуары на 13470 квадратных метраў і забрукаваны вуліцы на 88409 квадратных метраў, а таксама пасаджана 63000 дрэў і 75000 хмызнякоў [3, арк. 90]. Такім чынам, камунальная гаспадарка горада, нягледзячы на эканамічныя складанасці, стала паказваць пэўныя поспехі.

**Заключэнне.** Аналіз паказаў, што важнейшыя пытанні па рэалізацыі аднаўленчых мерапрыемстваў горада вырашаліся згодна з «Генеральным планам аднаўлення і планіроўкі г. Віцебска Белрускай ССР на пяцігоддзе 1946–1950 гг.» Трэба вызначыць, што першапачаткова назіраліся складанасці з рэалізацыяй плана з-за адсутнасці матэрыялаў і працоўных рук. Аднак, у гаспадарцы горада назіралася станоўчая тэндэнцыя развіцця: рост прамысловых аб'ктаў, паступовае павелічэнне жыллёвай плошчы, аднаўленне камунальна-інжынернага абсталявання і добраўпарадкаванне гарадскіх тэрыторый.

1. Витебск: Энциклопедический справочник / И. П. Шамякин (гл. ред.) и др. – Минск : БелСЭ им. П. Бровки, 1988. – 408 с.
2. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Ф. 2207. Воп. 2. Спр. 1.
3. ДАВВ. – Ф. 2207. Воп. 2. Спр. 4.
4. Русецкий, А. В. Архитектура и градостроительство в художественной культуре Витебщины. С 1918 года и до наших дней / А. В. Русецкий, Ю. А. Русецкий. – Витебск : УО "ВГУ им. П. М. Машерова", 2011. – 180 с.

## СМИ И ПОСТРОЕНИЕ КОНСОЛИДИРОВАННОЙ ДЕМОКРАТИИ

*Е.Э. Рудковская, А.А. Метелица*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*

Влияние, оказываемое СМИ на большинство сфер человеческого бытия, стало константой современного мира. За последнее десятилетие основным полем их деятельности постепенно стал Интернет. С появлением цифровых медиа информация не только стала доступнее, быстрее доходить до потребителя, нежели при использовании в качестве технического инструмента телевидения, печатных изданий и радио, но и получила возможность оперативного об-



Репозиторий ВГУ